# ЭВАКУАЦЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ЎСТАНОЎ З НЕАКУПАВАНЫХ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ У 1915 Г.

*В.М. Хаданёнак*
*Віцебск, ВДТУ*

Набліжаецца 100-гадовы юбілей заканчэння Першай сусветнай вайны. Між тым, звязаныя з ёй падзеі пакуль займаюць досыць сціплае месца ў памяці нашых грамадзян. У краіне, дзе вайна закранула кожнага: і таго, хто ваяваў у складзе рэгулярнай арміі, і мірнага жыхара, што быў змушаны цярпець голад, холад, нястачу, пакутаваць ад хвароб, пакідаць бацькоўскую хату, – да гэтага часу амаль няма помнікаў і музеяў, прысвечаных падзеям Першай сусветнай. У святле гэтага наспела пільная патрэба на аснове новага фактaлагічнага матэрыялу паспрабаваць абагуліць і пераасэнсаваць адну з найбольш драматычных старонак нашага мінулага, скасаваць пэўныя “белыя плямы” ў нашай гістарычнай навуцы.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца: разгледзець працэс эвакуацыі прадпрыемстваў і ўстаноў з беларускіх земляў у 1915 г..

**Матэрыял і метады.** Аб’ектам даследавання выступае неакупаваная тэрыторыя Беларусі ў межах Магілеўскай, Віцебскай і часткова Мінскай губерняў. Даследаванне было праведзена на аснове метадалагічных прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці. Яны дазволілі разгледзець з’явы і падзеі Першай сусветнай вайны ў адпаведнасці з канкрэтнай гістарычнай рэчаіснасцю, у іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Варта зазначыць, што у 1914 г. эвакуацыйныя мерапрыемствы на беларускіх землях не праводзіліся. Гэта адбывалася з-за таго, што аператыўны план вайны прадугледжваў вядзенне баявых дзеянняў на тэрыторыі Германіі і Аўстра-Венгрыі. Толькі восенню 1915 г. была створана эвакуацыйная камісія пры асобай нарадзе па абароне, якую ўзначаліў М.В. Радзянка.

Асаблівым галаўным болем для ваенных і цывільных улад неакупаваных беларускіх земляў у 1915 г. была эвакуацыя прадпрыемстваў з тых мясцовасцей, што знаходзіліся пад пагрозай хуткага нашэсця непрыяцеля. Яна праводзілася ў адпаведнасці з прынятай 2 кастрычніка 1915 г. “Пастановай аб камісіях па эвакуацыі” [1, с. 3].

Эвакуацыі ў першую чаргу належалі а) прамысловыя прадпрыемствы; б) гандлёвыя прадпрыемствы, якія мелі даволі істотныя запасы тавараў; в) установы і маёмасць, якія мелі важнае дзяржаўнае значэнне ці неабходныя для абароны краіны.

Эвакуацыя з раёна, які апынуўся пад пагрозай захопу, афіцыйна пачыналася з моманту выдання ваеннымі ўладамі загаду аб эвакуацыі. Затым, згодна з пастановамі мясцовых ваенна-прамысловых камітэтаў, ствараліся падрыхтоўчыя камісіі, якія павінны былі скласці падрабязны план эвакуацыі. Зразумела, што часу на гэта не заўжды хапала, і ў большасці выпадкаў такія планы складаліся непасрэдна эвакуацыйнымі камісіямі. Камісіі ствараліся пад верхавенствам асоб, якія прызначаліся старшынёй асобай нарады па абароне дзяржавы, і павінны былі быць узгоднены са штабам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Па адным прадстаўніку ў гэтыя камісіі маглі накіроўваць Цэнтральны ваенна-прамысловы камітэт (ЦВПК), Усерасійскія земскія і гарадскія саюзы, а таксама Цэнтральны камітэт ваенна-тэхнічнай дапамогі (ЦКВТД).

Пры выпрацоўцы плана эвакуацыі вызначаўся парадак перамяшчэння прадпрыемстваў, колькасць неабходных вагонаў і іншых перавозачных сродкаў, памер грашовай дапамогі рабочым і службоўцам эвакуіруемых устаноў, месца прызначэння кожнага выратоўваемага аб’екта [2, с. 12].

Даволі часта эвакуацыйныя камісіі накладалі значныя спагнанні і грашовыя штрафы на тыя прадпрыемствы, якія або не жадалі праводзіць эвакуацыйныя мерапрыемствы, або рабілі іх вельмі марудна.

Пра ўсе выпадкі адмовы ад выканання рашэнняў эвакуацыйных камісій іх старшыні неадкладна паведамлялі па тэлеграфе старшыні асобай нарады па абароне дзяржавы [1, с. 5]. Як правіла, меры ў адказ не прымушалі сябе чакаць.

У 1915 г. у сувязі з імклівым наступам нямецкіх войскаў былі вывезены ўглыб Расійскай імперыі 432 фабрычна-завадскія прадпрыемствы, асобныя фабрыкі і заводы былі дэманціраваны. Вельмі часта эвакуацыя праводзілася неарганізавана, з вялікімі стратамі абсталявання і гатовай прадукцыі. У той жа час у Беларусь эвакуіравалі заводы і фабрыкі з

Рэпазіторый ВДТУ

Польшчы і Прыбалтыкі. Так, з Варшаўскай губерні ў Мінск былі вывезены аўтамабільныя майстэрні і школа вадзіцеляў, у Нова-Барысаў – завод металічных вырабаў і алоўкавая фабрыка, у Магілёў – дзве фуфаечныя фабрыкі і гарбарны завод, у Гомель – чыгуначныя майстэрні і інш. [3, с. 187].

**Заключэнне.** Такім чынам, эвакуацыйная падрыхтоўка ў першы год вайны практычна адсутнічала. Гэта прывяло да таго, што шмат якія прадпрыемствы і ўстановы трапілі ў рукі ворага. Але, дзякуючы маруднаму наступу непрыяцеля і адносна невялікай глыбіні фронту, значных страт удалося пазбегнуць.


Спіс літаратуры

1. Эвакуация и реквизиция: справ. действующих узаконений и распоряжений по эвакуации, розыску эвакуир. грузов и реквизиции / Центр. воен.-пром. ком. – Петроград : Изд-во Эвакуац.-реквизиц. отд., 1916. – IV, 172 с.
2. Эвакуационная комиссия при Минском губернском объединённом земско-городском военно-промышленном комитете. – Минск : Типо-литогр. Б.И. Соломонова, 1915. – 88 с.
3. Дайняк, Е.Н. Экономика Беларуси в годы I мировой войны / Е.Н. Дайняк // Первая мировая война: история, геополитика, уроки истории и современность: к 90-летию окончания Первой мировой войны и началу формирования Версальско-Вашингтонской системы международных отношений : материалы междунар. науч. конф., Витебск, 11–12 нояб. 2008 г. / Витеб. гос. ун-т ; редкол.: В.А. Космач (гл. ред.) [и др.]. – Витебск, 2008. – С. 186–187.


## КОММУНИКАТИВНОЕ ПРОСТРАНСТВО ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ: СПЕЦИФИКА РЕЛИГИОЗНОЙ ИНФОРМАЦИИ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (КОНЕЦ XVIII – НАЧАЛО XX ВЕКА)


*П.В. Шевкун*
*Витебск, ВГМУ*


В конце XVIII в. в православной общине на белорусских землях начинаются знаковые перемены. В наиболее общем виде они выражались в том, что социальные объединения перестают совпадать с религиозными. Первоначально этот процесс разделения гомогенных общинно-религиозных структур происходилна интеллектуальном уровне. Религиозная информация приобретала индивидуализированные черты и всё более ориентировалась на конкретного прихожанина. Уже после отмены крепостного права и развития ранних демократических принципов организации общества стала усложняться и социальная стратификация, а подданные получили возможность менять или состоять одновременно в различных объединениях. Православной церкви необходимо было адаптироваться к стремительно меняющейся социальной реальности. Информационные тенденции первой половины XIX в. должны были найти своё логическое завершение в новых формах, создав комфортное для церкви коммуникативное пространство. На территории Беларуси эта необходимость была ещё более актуальна не только из-за поликонфессионального характера региона, но и в связи с неустойчивостью православных общин после ликвидации унии.

Цель работы выявить характерные черты религиозной информации в условиях социальной трансформации на территории Беларуси в конце XVIII – начале XX в.

**Материал и методы.** В работе использованы фонды № 2001 Национального исторического архива Беларуси и сборник указов Св. Синода. Анализ источников проводился на основе системного подхода и специальных научных методов: историко-генетического и историко-сравнительного.

**Результаты и их обсуждение.** На пути адаптации православной церкви необходимо было решить несколько задач, среди которых важнейшая заключалась в переходе от коллективного характера религиозной информации, характерной для традиционных отношений, к индивидуализированной, не разрушив при этом религиозную общину. Это был не простой процесс, поскольку два вида информации конфликтовали между собой. В частности это выражалось в «борьбе» с народными религиозными традициями или, с точки зрения модерной религиозной информации – суевериями. Народные традиции заполняли тот вакуум, который образовался между коллективистским характером религиозной информации прошлого и её индивидуальным восприятием в рамках общины. Средневековая церковь была в центре спасения. Человеку необходимо было довериться священнику и тем обрядам, которые он выполняет. Знать их религиозный смысл и, тем более, теологическую проблематику было излишним. Однако человеческий разум не мог удовлетвориться этой ограниченной информацией и наполнял весь окру-



Репозиторий ВГУ